# ШМАТГРАННАСЦЬ ДРАМАТУРГІІ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА

***Я. А. Астражынскі***

**Гімназія № 15 (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – Н. У. Дарган, настаўнік беларускай мовы і літаратуры***

**Анатацыя**. Артыкул прысвечаны аналізу драматургіі Георгія Марчука. Вызначаюцца асноўныя мастацкія характарыстыкі твораў драматурга.

**Ключавыя словы:** драматургія; аднаактавыя і шматактавыя п’есы; камедыя; драма; трагедыя.

У кожнага пісьменніка свой шлях у літаратуру. Адзін пачынае з вершаў, а потым робіцца выдатным празаікам. Другі звяртаецца да малых празаічных жанраў, а трэці – піша выдатныя драматургічныя творы.

Георгій Васільевіч Марчук – асоба шырокага жанравага дыяпазону. Маючы паходжанне з Палесся, яркая натура Г. Марчука ўвабрала ў сябе ўсё шматграннае хараство і багацце роднага краю і знайшла паўнакроўнае адлюстраванне ў яго творах. Драматургія – першая і самая значная любоў Георгія Васільевіча.

Станаўленне драматургічнага таленту Г. Марчука пачалося з аднаактавых п’ес, якія з’яўляюцца выдатнай школай майстэрства. Аднаактавая п’еса адкрывае магчымасць уважлівага псіхалагічнага даследавання характараў і адпавядае жаданню аўтара ў невялічкім творы ўзняць важныя агульначалавечыя праблемы. У аднаактоўках Г. Марчука «Магіла Чынгісхана», «Дыскатэка» праяўляецца ўплыў А. П. Чэхава, які часта выкарыстоўваў адкрытыя фіналы. Дзеянне ў п’есах вызначаецца імклівасцю і дынамізмам, у аснове сюжэтаў – незвычайныя, падчас парадаксальныя сітуацыі, якія выбіваюцца з традыцыйных жыццёвых умоў. Персанажы аднаактовак у пераважнай сваёй большасці адмоўныя, з’яўляюцца антыгероямі. Характары персанажаў раскрываюцца ў дзеянні і праз іх мову. Г. Марчук выкарыстоўвае прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы.

Пераход Г. Марчука да буйных драматургічных форм можна ўбачыць на прыкладзе аднаактавай п’есы «Дыскатэка». У адным творы аўтар спалучыў дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі: адметныя рысы аднаактавай п’есы

(гранічная сцісласць, бесперапыннасць дзеяння, адзіная драматычная сітуацыя) і характарыстыкі шматактавай драматургіі. У шостай карціне драматург скіроўвае ўвагу гледачоў на здарэнне, што адбылося на ўскраіне Брэста два гады таму. Такім чынам, прасочваецца шматмернасць мастацкага часу п’есы. У творы прысутнічае значна большае кола дзеючых асоб, чым патрабуе аднаактавая п’еса.

У шматактавай лірычнай камедыі «Люцікі-кветачкі» прасочваецца ўплыў класікаў беларускай літаратуры (В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы), выкарыстоўваецца традыцыйныя сюжэт і канфлікт. Аднатыпны сюжэт – каханне дзяцей на фоне сваркі бацькоў – пакладзены ў аснову трагедыі У. Шэкспіра «Рамэа і Джульета», фарса В. Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта» і Г. Марчука «Люцікі-кветачкі». Сваё раскрыццё ідэя знаходзіць праз вырашэнне сямейна-бытавых і маральна-этычных праблем.

Ужо ў першай шматактавай п’есе Г. Марчук намаляваў псіхалагічны партрэт свайго сучасніка з усімі станоўчымі і адмоўнымі рысамі характару. Як і ў аднаактавых п’есах, драматург часта выкарыстоўвае вобразы-сімвалы. У п’есе «Люцікі-кветачкі» гэта кветкі. Расліны, якія ўпрыгожваюць падворак, у творы выступаюць і як сродак заробку, і як метафара малодшага пакалення.

Аснову драмы «Пеўчыя 41 года» склалі рэальныя падзеі, якія адбыліся ў раёне Крычава. Рэальныя факты ў драме трактуюцца аўтарам свабодна, ён абапіраецца на ўласную фантазію. Драма вызначаецца глыбокім канфліктам, а таксама філасофска-маральнай праблематыкай. Гэту п’есу можна назваць п’есай-дыскусіяй.

Пераход ад камедыі да драмы абумовіў падрыхтоўку і напісанне двух твораў аднаго з самых старажытных жанраў – трагедыі – дылогію «Менелай, Алена і Парыс» і «Арэст і Касандра».

Першакрыніцай трагедыі «Арэст і Касандра» з’яўляюцца міфы Старажытнай Грэцыі. Драматург звяртаецца не толькі да філасофіі гісторыі, але і да праблем адказнасці і раўнадушша чалавека да таго, што адбываецца ў пераломныя моманты развіцця грамадства. Трактуючы па-свойму вобраз Арэста, аўтар бачыць прычыны яго бессэнсоўнай агрэсіі ў дзіцячай псіхалагічнай траўме.

Пры трактоўцы вобраза Касандры Г. Марчук прытрымліваецца традыцыйнай легенды: дачка Прыама пакутуе, бо не можа толькі сваёй воляй перашкодзіць злу. Ход падзей прыводзіць Касандру да сувязі з чужым мужам. Такім чынам, драматург прыцягвае ўвагу да праблемы сучаснага грамадства, калі сёння становіцца нормай з’яўленне жанчын, згодных мірыцца з роляй каханкі. На аснове міфаў і гісторыі старажытнай Грэцыі былі створаны героі, філасофія якіх супадае

з гістарычным часам і сённяшнім днём. Міфалагічны сюжэт, выкарыстаны Марчуком, дапамагае вырашэнню актуальных праблем сучаснасці.

У п'есах для падрастаючага пакалення пісьменнік нярэдка ўжывае народныя выслоўі, прымаўкі і прыказкі, характэрныя словы і звароты, дзякуючы чаму яго творы захоўваюць нацыянальны каларыт. Пачаткам творчасці Г. Марчука над п'есамі-казкамі можна лічыць камедыю-лубок «Новыя прыгоды Несцеркі» (1977), у якой аўтар не абышоў класічны сюжэт пра героя народнай смехавай культуры Несцерку, але ўнёс і новае ў яго характарыстыку.

У п'есах-казках для падрастаючага пакалення Г. Марчук заявіў пра сябе як свайго роду парушальнік традыцый. Яго п'есы-казкі вылучаюцца стракатасцю антуражу і дзеючых асобаў. Дзеянні ў іх адбываюцца як у далёкіх экзатычных краінах («Тушканчык і чароўны чамаданчык», 1984; «Надзея сабакі Тэафіла», 1988), так і, здавалася б, зусім побач, толькі чытачам трэба «распазнаць» свет, падзеі якога выпісаны пісьменнікам («Ясь, Яніна і каралева Аварыя», 1985). Гэтым аўтар пашырае кола тэм і праблем. У некаторых творах пісьменнік асцярожна з'ядноўвае традыцыйны казачны свет з рэаліямі сённяшняга дня: у герояў з'яўляюцца камп'ютары, лазары, самалёты (п'еса-казка «Чужое багацце»). Нестандартным падыходам толькі прываблiваюцца юныя гледачы, гатовыя пайсці следам за аўтарам у краіну незнаёмага і незвычайнага.

Такім чынам, для драматургіі пісьменніка характэрна наяўнасць наступных мастацкіх рыс: новы тып героя, багацце мовы персанажаў, наследванне ўзораў класічнай літаратуры, выкарыстанне смехавой народнай традыцыі, цесная ўзаемасувязь з фальклорам, разнастайнасць драматургічных жанравых форм.